**УДК 930**

# ПЕРАПІСКА МІХАЛА ЧАРТАРЫЙСКАГА З МІХАЛАМ МАСАЛЬСКІМ З ФОНДАЎ ПОЛЬСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ Ў ПАРЫЖУ ЯК КРЫНІЦА ПА ПАЛІТЫЧНАЙ ГІСТОРЫІ ВКЛ 1737–1764 гг.[1]

***канд. гіст. навук А.У. МАЦУК***
***(Інстытут гісторыі НАН Беларусі, Мінск)***

*На падставе перапіскі з Польскай бібліятэкі ў Парыжы даследуецца палітычная гісторыя ВКЛ 1737–1764 гг. Удалося ўстанавіць месца і роль Міхала Масальскага ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ у 30–60-х гг. XVIII ст., а таксама размеркаванне роляў сярод лідараў Фаміліі. Удакладняецца пазіцыя кіраўнікоў Фаміліі ў тых ці іншых палітычных здарэннях. Вызначаюцца агульнае і адрознае ў пазіцыі групоўкі Міхала Масальскага адносна іншых лідараў Фаміліі і прычыны яго канфлікту з імі ў 1761–1762 гг.*

***Ключавыя словы:*** *магнаты, магнацкія групоўкі, перапіска, соймікі, новыя крыніцы, Фамілія.*

**Уводзіны.** Перыяд 1737–1764 гг. – час, калі на палітычнай сцэне ВКЛ на вядучых ролях знаходзілася магнацкая групоўка Фамілія. На чале яе ў ВКЛ былі канцлер ВКЛ Міхал Чартарыйскі, падканцлер ВКЛ Міхал Антоній Сапега, падскарбі ВКЛ Юрый Флемінг, польны гетман ВКЛ і віленскі кашталян Міхал Масальскі. У Польскай бібліятэцы ў Парыжы захоўваюцца 35 лістоў Міхала Чартарыйскага да Міхала Масальскага з 1737 па 1764 гады. На самой справе гэтых лістоў 34, а ліст ад пад нумарам 23 ад 3 сакавіка 1760 г. з Воўчына з'яўляецца лістом Міхала Чартарыйскага не да Міхала Масальскага, а да Міхала Казіміра Радзівіла [1, p. 105]. Напэўна праз памылку архівіста ліст, падпісаны да віленскага ваяводы і вялікага гетмана ВКЛ, патрапіў у справу з лістамі да віленскага кашталяна і польнага гетмана ВКЛ Міхала Масальскага.

У гістарыяграфіі вядома толькі адна карэспандэнцыя паміж лідарамі Фаміліі ў ВКЛ – перапіска Міхала Чартарыйскага з Міхалам Антоніям Сапегай, якая знаходзіцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Польшчы [2]. Перапіска з Польскай бібліятэкі ў Парыжы паміж Міхалам Чартарыйскім і Міхалам Масальскім уяўляе вялікую цікавасць, бо дазваляе зразумець месца і роль Масальскага ў гэтай магнацкай групоўцы. Раней такія спробы прадпрымала ў сваёй манаграфіі аб Фаміліі толькі польская даследчыца Зафія Зялінская [3, s. 360]. Аднак, пры напісанні гэтай працы Зафіі Зялінскай была невядома карэспандэнцыя з Польскай бібліятэкі ў Парыжы.

**Асноўная частка.** У першым лісце ад 7 лістапада 1737 г. з Гданьска Міхал Чартарыйскі прасіў Міхала Масальскага старацца аб выбары прыхільных дэпутатаў на грамнічных сойміках 1738 г. Больш таго, прапаноўваў Масальскаму самому стаць дэпутатам і быць абраным маршалкам Трыбунала ВКЛ. Асабліва каштоўным бачыў гэта ў год правядзення сойма. Менавіта таму, Масальскі мог за гэта быць узнагароджаны каралеўскім дваром. Чартарыйскі заклікаў супрацоўнічаць у трыбунальскай кампаніі з падскарбіям ВКЛ Янам Салагубам і стражнікам ВКЛ Антоніям Пацеем, інфармаваў, што Радзівілы падтрымліваюць выбар трыбунальскім маршалкам віцебскага ваяводы Марціна Агінскага, аднак быў перакананы, што Масальскі выйдзе пераможцам у змаганні з Марцінам Агінскім за гэты ўрад [1, p. 19–21]. Гэты ліст дазваляе па іншаму паглядзець на планы Фаміліі адносна Трыбунала ВКЛ 1738 г. Становіцца зразумела, што Фамілія хацела, каб Трыбунал ВКЛ 1738 г. аказаўся пад кантролем яе саюзнікаў: Масальскага, Салагуба і Пацея. Для гэтага Фамілія была гатова змагацца з Радзівіламі, якія дамінавалі ў княстве. Адначасова гэта не было патрэбна Чартарыйскім для нібыта якіх канфедэрацкіх планаў [4, s. 77–79]. Кантроль над Трыбуналам ВКЛ 1738 г., на думку Міхала Чартарыйскага, меў узмацніць пазіцыі Фаміліі і яе саюзнікаў у княстве перад каралеўскім дваром, бо таму было важна, хто будзе кантраляваць Трыбунал ВКЛ у год правядзення сойма.

У лісце ад канца лютага 1742 г. Міхал Чартарыйскі інфармаваў аб "незаконным" выбары дэпутатам у Троках полацкага кашталяна Валярыяна Жабы. Зразумела, што пры падтрымцы сваіх пратэктараў Радзівілаў ён стараўся аб трыбунальскім маршалкоўстве, а супраць яго кандыдатуры не было сур'ёзнага канкурэнта. Міхал Чартарыйскі пытаўся аб планах саюзнікаў (Сапегаў, Масальскага, Станіслава Агінскага і Яна Салагуба): ці будуць яны перашкаджаць Жабе стаць трыбунальскім маршалкам і ці маюць для гэтага прыхільнікаў і фінансавыя сродкі? У канцы ліста Чартарыйскі вярнуўся да гэтай

[1] Артыкул выкананы ў межах выканання праекта БРФФІ № Г15Ф-001: "Французскія і франкамоўныя рукапісы ў Беларусі (XVIII–пачатку XX ст.)".

справы, ён папярэджваў аб згодзе Сапегаў і Яна Салагуба, каб маршалкам Трыбунала ВКЛ быў Валярыян Жаба [1, p. 23–24]. Гэты ліст пацвярджае, што менавіта Міхал Масальскі займаў ключавую ролю ў кантактах паміж Міхалам Чартарыйскімі і іншымі ўдзельнікамі кааліцыі – Сапегамі [5, s. 177; 6, с. 213–214]. Менавіта праз яго падканцлер ВКЛ узгадняў планы з усімі ўдзельнікамі кааліцыі. Яму ж перадаваў канфедэнцыяльную інфармацыю аб згодзе іншых удзельнікаў кааліцыі аб выбары радзівілаўскага прыхільніка Валярыяна Жабы маршалкам Трыбунала ВКЛ.

Чартарыйскі быў для Масальскага крыніцай інфармацыі аб знешнепалітычных падзеях. У сваім лісце Чартарыйскі інфармаваў аб падзеях (арышт рэгента Эрнста Бірона), якія адбыліся ў Пецярбургу і лічыў, што яны прынясуць Рэчы Паспалітай новыя перамены, звязаныя з Курляндыяй (выбары новага герцага замест Бірона) [1, p. 24]. Інфарміраваў Міхал Чартарыйскі і аб магчымых падзеях унутрыпалітычнага жыцця Рэчы Паспалітай. Так, у сваім лісце ад 7 жніўня 1742 г. з Воўчына Чартарыйскі перадаваў інфармацыю, што кароль з’явіцца ў Рэчы Паспалітай не раней кастрычніка 1743 г. з мэтай склікання новага сойма [1, p. 27].

Увогуле Чартарыйскі і Масальскі мелі агульныя думкі не толькі аб выбарах на дэпутацкіх сойміках, але і ў размеркаванні ўрадаў. Яны абодва падтрымалі Сымона Сіруця ў яго барацьбе з Пацеямі за ўрад ковенскага гродскага старосты. Міхал Чартарыйскі выказваў Масальскаму сваё спадзяванне, што ўдасца супакоіць справу аб атрыманні ковенскага гродскага староства Сымонам Сіруцем. Падканцлер ВКЛ меркаваў, што не будзе неабходнасці разглядаць справу ў асэсарскім судзе. Прычынай быў зварот каралеўскага двара да троцкага ваяводы Аляксандра Пацея, каб ён перастаў перашкаджаць Сіруцю ў атрыманні ковенскага гродскага староства [1, p. 27].

У сваю чаргу Міхал Чартарыйскі ўдакладняў у Масальскага незразумелыя пытанні ў ВКЛ. Так, ён прасіў Масальскага даведацца, на якой падставе пруская каралеўская дынастыя Гагенцолерны трымае ўладанні ў ВКЛ (мелася на ўвазе частка “нойбургскіх уладанняў” – Таўрогі і Сярэі) [1, p. 32]. Ужо ў гэты час Міхал Масальскі быў для Чартарыйскага даверанай асобай, які мог выканаць самыя складаныя просьбы ў княстве. Менавіта Масальскага Чартарыйскі прасіў дазнацца, хто быў ініцыятарам выдання друку ў Вільні, які заклікаў да антыкаралеўскай канфедэрацыі ў Рэчы Паспалітай. З яго слоў, падобны друк быў распаўсюджаны і ў Вялікапольшчы. Ініцыятарам яго быў шведскі палкоўнік Бона, які ўжо быў затрыманы ўладамі. У яго паперах было знойдзена шмат лістоў магнатаў ВКЛ. Сярод іх Чартарыйскі называў толькі стольніка ВКЛ Пятра Сапегу [1, p. 27–28].

Галоўным ва ўзаемаадносінах абодвух магнатаў заставалася пытанне выбараў на дэпутацкіх сойміках. Ужо ў жніўні 1742 г. Чартарыйскі прапаноўваў Масальскаму сабрацца і абмеркаваць планы аб будучым Трыбунале ВКЛ. На гэтай нарадзе спадзяваўся сустрэцца з Міхалам Антоніям і Юзафам Станіславам Сапегамі, якія знаходзіліся недалёка і абяцалі хутка прыбыць [1, p. 29]. Грамнічныя соймікі паспяхова скончыліся для кааліцыі, а яе кандыдат – Міхал Антоній Сапега – быў абраны дэпутатам на мазырскім сойміку. Пачаліся доўгія перамовы з каралеўскім дваром аб зацвярджэнні яго кандыдатуры. Актыўна ў гэтым удзельнічаў падканцлер ВКЛ. Пацвярджае гэта і яго ліст ад 13 красавіка 1743 г. да Міхала Масальскага. У ім Міхал Чаратрыйскі інфармаваў, што напісаў у каралеўскі двор у падтрымку кандыдата ад кааліцыі на ўрад трыбунальскага маршалка. Магчымае супрацьдзеянне з боку Міхала Вішнявецкага, са слоў Чартарыйскага, меў прыбраць дасланы ў Вільню ад каралеўскага двара генерал артылерыі ВКЛ Юрый Флемінг. Чартарыйскі прасіў падтрымаць да ўрада пісара віленскай кадэнцыі Станіслава Бужыньскага, а да ўрада пісара рускай кадэнцыі – Юзафа Сасноўскага [1, p. 31].

У ліпені 1743 г. падканцлер ВКЛ стараўся на каралеўскім двары для Масальскага аб атрыманні ўрада надворнага маршалка ВКЛ. Праўда, агаворваў, што для Масальскага гэта толькі часовы ўрад на шляху да ўрада польнага гетмана ВКЛ. Прычым Чартарыйскаму было вядома, што хвароба вялікага гетмана ВКЛ Міхала Вішнявецкага абвастрылася, і таму хутка будзе вольная і булава. Вялікім гетманам ВКЛ меў стаць Міхал Казімір Радзівіл, а вызвалены ўрад польнага гетмана ВКЛ меркавалася надаць Міхалу Масальскаму. Аб хваробе Вішнявецкага і планах размеркавання ўрадаў Чартарыйскі спяшаўся паведаміць і Масальскаму [1, p. 35]. На самой справе складана выявіць прычыны, з-за якіх падканцлер ВКЛ стараўся аб часовым урадзе для Масальскага. Магчымым тлумачэннем дзейнасці падканцлера ВКЛ бачыцца тое, што Чартарыйскі ведаў пра добрае стаўленне да Масальскага на каралеўскім двары і з яго дапамогай імкнуўся перашкодзіць атрымаць урад надворнага маршалка ВКЛ варожым Фаміліі магнатам ВКЛ. Гэта спроба, аднак, скончылася нічым і ўрад надворнага маршалка ВКЛ атрымаў абозны ВКЛ Ігнат Агінскі.

Магчыма на каралеўскім двары не далі Масальскаму ўрад надворнага маршалка ВКЛ, бо ведалі аб хваробе Вішнявецкага і што хутка вызваліцца ўрад польнага гетмана ВКЛ. Пасля смерці Міхала Вішнявецкага Міхал Чартарыйскі даслаў Масальскаму свой і Станіслава Панятоўскага лісты да Бруля і ксёндза Гуарыні. У іх яны згодна ранейшым дамоўленасцям прасілі надаць Масальскаму ўрад польнага

гетмана ВКЛ [1, p. 39]. Гэта паспяхова адбылося, і Масальскі стаў польным гетманам ВКЛ. Важную ролю ў гэтым адыграла пратэкцыя Фаміліі. Праўда, Міхал Чартарыйскі не заўжды падтрымліваў просьбы аб урадах рэкамендаваным Масальскім асобам. Так, Міхал Чартарыйскі адмовіўся дапамагаць па просьбе Масальскага лідскаму скарбніку Каміньскаму заняць урад лідскага чашніка. Прычынай была непрыязнь таго да Чартарыйскага [1, p. 36]. У выніку лідскім чашнікам стаў прыхільнік Фаміліі Францішак Александровіч.

У 1744 г. у княстве адбылося прымірэнне асноўных магнацкіх родаў. У ВКЛ склалася "вялікая кааліцыя" магнацкіх родаў Чартарыйскіх, Радзівілаў, Сапегаў і Масальскіх. Гэтая кааліцыя дамінавала ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ. У 1745 г. Чартарыйскі выклаў Масальскаму свой план падзелу ўрадаў у Трыбунале ВКЛ. Згодна яму, трыбунальскім маршалкам меў стаць троцкі ваявода Аляксандр Пацей, літоўскім пісарам – Давойна, рускім пісарам – Валадковіч. Прычыну выбару апошняга тлумачыў вялікімі просьбамі ў яго падтрымку Міхала Казіміра Радзівіла. У такой сітуацыі стражнік ВКЛ Ігнат Ланеўскі Воўк мог стаць маршалкам Скарбовага Трыбунала ці віцэ-маршалкам Трыбунала ВКЛ [1, p. 44–45]. У гэтым плане не было нічога незвычайнага, бо ён раней быў узгоднены паміж усімі вядучымі магнацкімі групоўкамі княства [6, с. 249–251]. Адносна рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ 1745 г. Чартарыйскі прасіў Масальскага не дапусціць у лік трыбунальскіх суддзяў наваградскіх дэпутатаў, а прасіў падтрымаць брэсцкага дэпутата Пятра Пашкоўскага, каб яму не перашкодзілі шляхціцы Верашчакі ўвайсці ў лік трыбунальскіх суддзяў [1, p. 45]. У гэтых просьбах Чартарыйскага да Масальскага не было нічога незвычайнага, ідэнтычныя просьбы былі накіраваны да вялікага гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Радзівіла [6, с. 251].

Існаванне "вялікай кааліцыі" не прыбрала канкурэнцыі паміж магнатамі за ўрады і ўладанні. Першыя вольныя ўрады з'явіліся ў 1746 г. пасля смерці наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла. У гэты час нічым скончыліся стаpанні падканцлера ВКЛ аб вайсковых урадах для Масальскіх. Прычынай быў больш ранні зварот да караля аб гэтых урадах для дзяцей памерлага. Іх падтрымаў і вялікі гетман ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл [1, p. 47].

Яшчэ перад выбарамі ў Трыбунал ВКЛ 1746 г. у межах "вялікай кааліцыі" было дамоўлена, што пісарам віленскай кадэнцыі стане войскі ВКЛ Дамінік Саванеўскі. Было агаворана, што дэпутатам ён будзе абраны на віленскім сойміку, каб яму лягчэй было стаць пісарам віленскай кадэнцыі, бо віленскія дэпутаты згодна традыцыі мелі першынство да гэтага трыбунальскага ўрада [7, s. 112–114]. У выніку на віленскім сойміку былі абраны аж тры дэпутаты: Дамінік Саванеўскі, Міхал Гарадзенскі і Станіслаў Нарбут. Міхал Чаратрыйскі прыклаў вялікія намаганні, каб пісарам віленскай кадэнцыі стаў менавіта Саванеўскі. Сярод іншага ён прасіў Міхала Масальскага прасіць аб падтрымцы для Саванеўскага ў Міхала Казіміра Радзівіла. Акрамя таго, Чартарыйскі спрабаваў самастойна прымусіць аднаго з трох віленскіх дэпутатаў адмовіцца ад дэпутацтва. Падканцлер ВКЛ дамаўляўся з дырэктарам сойміка Манкевічам, каб той падпісаў крэдэнс віленскім дэпутатам Саванеўскаму і Богушу. Прычым вырашальную ролю ў гэтых перамовах Чартарыйскі адводзіў як раз Міхалу Масальскаму. Падканцлер ВКЛ быў перакананы, што калі Масальскі напіша да Манкевіча такую просьбу, то той дакладна паслухаецца [1, p. 47].

Супрацьстаяла "вялікай кааліцыі" вядучых магнатаў ВКЛ кааліцыя Агінскіх, Салагубаў і наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла. Найбольшым уплывам яны валодалі на ўсходніх сойміках княства. Грамнічныя соймікі 1746 г., аднак, паказалі перавагу прыхільнікаў "вялікай кааліцыі". Міхал Чартарыйскі з задавальненнем заўважаў Масальскаму аб няўдачах іх праціўнікаў на "беларускіх сойміках" (усходніх сойміках ВКЛ) [1, p. 47–49]. Праблему для "вялікай кааліцыі" несла толькі праблема спадчыны Міхала Вішнявецкага, бо магла перасварыць паміж сабой яе ўдзельнікаў Чартарыйскіх, Сапегаў і Радзівілаў. Лоўчы ВКЛ Міхал Антоній Сапега падчас перамоў у Львове адмовіўся саступіць спадчынікам Вішнявецкага, якіх падтрымліваў Чартарыйскі. Не саступіў ён і Міхалу Казіміру Радзівілу. З-за гэтага Чартарыйскі скардзіўся Масальскаму, што ня можа ўзгадніць згодна ранейшым дамоўленасцям размеркаванне ўрадаў у Трыбунале ВКЛ. Тым больш, што аб урадзе пісара рускай кадэнцыі прасілі некалькі канкурэнтаў. Для аднаго з іх, Мікалая Тадэвуша Лапацінскага, падканцлер ВКЛ меркаваў іншы трыбунальскі ўрад – маршалка Скарбовага Трыбунала. Чартарыйскі абавязкова хацеў ведаць думку Масальскага на гэты конт. Адначасова паведамляў, што згодна ранейшай просьбы ўжо дамовіўся з Радзівілам, каб лідскі дэпутат і лідскі чашнік Францішак Александровіч стаў трыбунальскім падскарбіям [1, p. 49–50]. Нажаль нам невядомы адказ Масальскага, але магчыма з-за яго пазіцыі Мікалай Тадэвуш Лапацінскі стаў не маршалакам Скарбовага Трыбунала, а пісарам рускай кадэнцыі.

Наступны ліст Міхала Чартарыйскага да Міхала Масальскага быў напісаны 9 сакавіка 1748 г. і датычыцца ўжо Трыбунала ВКЛ 1748 г. Гэты Трыбунал ВКЛ быў вельмі важным для Масальскіх. На ім магла разглядацца іх судовая справа з Сапегамі аб спадчыне мсціслаўскага ваяводы Юрыя Станіслава Сапегі. На частку гэтай спадчыны прэтэндаваў ваўкавыскі гродскі староста Казімір Масальскі, які быў

жанаты на дачцэ Юрыя Станіслава Сапегі Крысціне. Менавіта таму Масальскія імкнуліся, каб маршалкам Трыбунала ВКЛ стаў гарадзенскі гродскі староста Юзаф Андрыян Масальскі. На гэта пагадзіліся Радзівілы і Чартарыйскія. Таму зразумела, што пры размеркаванні іншых урадаў вялікае значэнне мела пазіцыя лідара Масальскіх і бацькі гарадзенскага гродскага старосты Міхала Масальскага. Тым больш, што Радзівіл адмовіўся выконваць ранейшую дамову з Чартарыйскім і замест пісара рускай кадэнцыі Віктара Хэлхоўскага імкнуўся, каб гэты ўрад атрымаў наваградскі дэпутат Антоній Рдултоўскі. Міхал Чартарыйскі дзякаваў Міхалу Масалькаму за абяцаную падтрымку Хэлхоўскага да ўрада пісара рускай кадэнцыі. Адначасова прасіў не дапускаць у лік трыбунальскіх суддзяў наваградскіх дэпутатаў, якія мелі слушныя пратэстацыі супраць свайго выбару. Наваградскі соймік, дзе былі нібыта абраны дэпутаты, адбыўся “прыватна” і нават без ведама вядучых мясцовых ураднікаў, якія сядзелі да паздна на звычайным месцы правядзення соймікаў. Чартарыйскі называў Масальскаму і галоўную небяспеку, калі наваградскі соймік будзе прызнаны законным. Падобным спосабам далей маглі адбывацца ўсе наваградскія і мінскія дэпутацкія соймікі. Зразумела, што дэпутаты з іх згодна традыцыі першынства сталіся бы пісарамі рускай кадэнцыі [1, p. 52–53]. Як бачым, у канфлікце паміж Радзівілам і Чартарыйскім Міхал Масальскі прыняў бок падканцлера ВКЛ. Іншая справа, што гэты ліст не дае магчымасці зразумець на колькі вялікую ролю ў будучым размеркаванні трыбунальскіх урадаў Міхал Чартарыйскі адводзіў Міхалу Масальскаму.

Падрабязна ў сваім лісце ад 25 снежня 1749 г. з Беластока Міхал Чартарыйскі ўзгадняў планы з Міхалам Масальскім наконт выбараў на Трыбунал ВКЛ 1750 г. Напачатку з задавальненнем заўважаў, што Міхал Казімір Радзівіл шмат разоў шкодзіў ім, але зараз сам мусіць шукаць згоды Фаміліі. Чартарыйскі падкрэсліваў, што за згоду, каб сыны Радзівіла былі трыбунальскімі суддзямі, а адзін з іх стаў трыбунальскім маршалкам, вялікі гетман ВКЛ пагадзіўся, каб урады маршалка Скарбовага Трыбунала і пісара рускай кадэнцыі атрымалі прыхільнікі Фаміліі. Больш таго, Радзівіл абяцаў не перашкаджаць прыхільнікам Фаміліі на грамнічных сойміках. Падканцлер ВКЛ заўважаў, што калі Радзівіл перадумае, то неабходна будзе пераслаць узгодненыя яго ўласнай рукой планы наконт Трыбунала ВКЛ. Прасіў Чартарыйскі Масальскага для забеспячэння адзінства Фаміліі на Трыбунале ВКЛ 1750 г. вырашыць спрэчныя справы Масальскіх з Міхалам Антоніям Сапегай [1, p. 55]. Пазней Чартарыйскі інфармаваў аб пераменах у плане Радзівіла. Сам ён даведаўся аб гэтых планах ад кракаўскага ваяводы Станіслава Панятоўскага, якому аб іх паведаміў каронны падскарбі Караль Юзаф Сядльніцкі. Аб сваіх планах Сядльніцкаму напісаў сам Міхал Казімір Радзівіл. Згодна новаму плану трыбунальскім маршалкам меў стаць рэчыцкі гродскі староста Альбрэхт Радзівіл. На думку Чартарыйскага, гэта было выклікана малой колькасцю радзівілаўскіх прыхільнікаў сярод абраных дэпутатаў. У такой сітуацыі ўзнікалі складанасці для маршалка ў кіраванні Трыбуналам ВКЛ 1750 г. Канчатковае рашэнне на такія перамены плана Радзівіла Чартарыйскі пакідаў Міхалу Масальскаму. Сам раіў згадзіцца, бо ў іх нічога не было шкоднага для Фаміліі. Кандыдатам на ўрад маршалка Скарбовага Трыбунала Чартарыйскі прапаноўваў Лапацінскага, якому сам абяцаў падтрымку. Зрабіў ён гэта, яшчэ калі да грамнічных соймікаў угаворваў Лапацінскага старацца аб выбары дэпутатам. На ўрад пісара рускай кадэнцыі падканцлер ВКЛ лепшым кандыдатам бачыў прыхільніка Масальскага – гродзенскага земскага пісара Караля Храптовіча. Чартарыйскі паведамляў, што на гэты ўрад прэтэндаваў і прасіў у яго падтрымкі слонімскі дэпутат Мікульскі. Падтрымліваў Мікульскага і Міхал Антоній Сапега, бо гэта быў яго прыхільнік, аднак Чартарыйскі, згодна ранейшаму плану, быў гатовы падтрымаць Храптовіча. Адзінае, што Чартарыйскі лічыў, калі будуць моцныя перашкоды Храптовічу, то тады пісарам рускай кадэнцыі лепей абраць Мікульскага. Адначасова прасіў супакоіць пратэсты Сляшыньскага і Коркуця супраць ваўкавыскага і лідскага соймікаў [1, p. 59–60]. Фактычна гэты ліст дае шмат цікавай інфармацыі. Па-першае, мы даведваемся, што толькі пасля дэпутацкіх соймікаў Чартарыйскі пазнаў планы Міхала Казіміра Радзівіла зрабіць трыбунальскім маршалкам не аднаго з сыноў, а родзіча – рэчыцкага гродскага старосту Альбрэхта Радзівіла. Па-другое, пра вельмі складаны шлях, як гэтая інфармацыя праз каронных ураднікаў стала вядома Міхалу Чартарыйскаму. Гэта тым больш цікава, што Масальскаму аб гэтым паведаміў яшчэ 13 лютага сваім лістом сам Міхал Казімір Радзівіл [8, k. 197–198]. Па-трэцяе, пра яшчэ некаторыя падрабязнасці канфлікту паміж лідарамі Фаміліі аб размеркаванні трыбунальскіх урадаў. Галоўнае, становіцца зразумела, што ў пытанні размеркавання трыбунальскіх урадаў Масальскі выступаў разам з Флемінгам і Чартарыйскім супраць Міхала Антонія Сапегі. Цікава, што Чартарыйскі лічыць Караля Храптовіча прыхільнікам Масальскага, а не толькі, як прынята ў літаратуры, прыхільнікам Флемінга [3, s. 357; 6, c. 341].

Наступны ліст Міхала Чартарыйскага да Міхала Масальскага быў напісаны пасля грамнічных соймікаў 1753 г. (28 лютага 1753 г.) і галоўным чынам датычыўся размеркавання трыбунальскіх урадаў. Чартарыйскі выказваў задаволенасць з абраных дэпутатаў на Трыбунал ВКЛ 1753 г. Заўважаў, што ўсё адбылося згодна іх плану, які быў складзены падчас сойму 1752 г. Адначасова канцлер ВКЛ прасіў пад-

трымкі для ковенскіх дэпутатаў: лоўчага ВКЛ Ігната Ланеўскага Ваўка – да ўрада маршалка ВКЛ і векшнянскага старосты Міхала Горскага – да ўрада маршалка Скарбовага Трыбунала. Раіў не спяшацца з падтрымкай да ўрада пісара рускай кадэнцыі, бо і так няма сур'ёзных кандыдатаў [1, p. 69, 72]. Гэты ліст удакладняе вядомую інфармацыю пра выбары на гэты Трыбунал ВКЛ толькі ў тым, што планы Фаміліі адносна яго былі складзены яшчэ падчас сойма 1752 г.

У гэты час Міхал Чартарыйскі вельмі прыязна ставіўся да Міхала Масальскага. Асабліва задаволенны канцлер ВКЛ быў падтрымкай Міхалам Масальскім планаў атрымаць якое-небудзь дыгнітарства ВКЛ для Юзафа Сасноўскага. Гэтую інфармацыю перадаў Чаратрыйскаму Міхал Антоній Сапега. Польны гетман ВКЛ не толькі абяцаў падтрымаць Сасноўскага, але і тое, што канкурэнтам яму не будзе гарадзенскі гродскі староста Юзаф Андрыян Масальскі [1, p. 70–71]. Гэта дазваляла Чартарыйскаму старацца для Сасноўскага аб першым дыгнітарстве ВКЛ і не баяцца пакрыўдзіць Масальскіх. Гэта тым больш было важна ў сітуацыі разыходжання Фаміліі з каралеўскім дваром і пераходам яе ў шэрагі антыкаралеўскай апазіцыі.

З часам, аднак, адносіны паміж канцлерам ВКЛ і польным гетманам ВКЛ пагоршыліся. Масальскі, у адрозненні ад Чартарыйскага, спрабаваў захаваць добрыя адносіны з каралеўскім дваром. Адной з галоўных прычынаў было імкненне Міхала Масальскага атрымаць урад віленскага каад'ютара для сына Ігната. З гэтай мэтай Міхал Масальскі паехаў на каралеўскі двор у Дрэздэн. Аднак каралеўскі двор не хацеў узмацняць Фамілію і надаваць Ігнату Масальскаму віленскую каад'юторыю. Расчараваны Масальскі ні з чым вярнуўся да дому. Менавіта да гэтага часу, ліпень-верасень 1755 г, адносіцца наступны недатаваны ліст Міхала Чартарыйскага да яго. У ім Міхал Чартарыйскі выказваў Міхалу Масальскаму вялікае шкадаванне, што той не завярнуў у Воўчын, вяртаючыся ў княства з Дрэздэна. Чартарыйскі лічыў, што такая сустрэча была неабходна для ўзгаднення далейшых планаў. Выказваў Чартарыйскі і спачуванні, што побыт Міхала Масальскага ў Дрэздэне не прынёс чаканага ўрада віленскага каад'ютара для сына польнага гетмана. Канцлер ВКЛ раіў моцна старацца аб выбары прыхільных дэпутатаў на будучых грамнічных сойміках. Гэта было неабходна, каб паказаць каралеўскаму двару сваю моц і значную колькасць прыхільнікаў [1, p. 77–78]. Яшчэ Чартарыйскі перадаваў інфармацыю, што расійскі двор загадаў паслу Генрыху Гроссу моцна старацца аб урадзе наваградскага ваяводы для брэсцкага кашталяна Яна Храптовіча [1, p. 79]. Зразумела, што гэтая просьба за Храптовічам спазнілася, і ўрад наваградскага ваяводы ўжо атрымаў Юзаф Аляксандр Ябланоўскі [9, s. 53–54]. Аднак гэтая інфармацыя мела паказаць Масальскаму, што Фамілія, як і яе прыхільнік Храптовіч, і далей карыстаецца падтрымкай Расіі. Гэта мела даць спадзяванне атрымаць пры яе падтрымцы ўрад віленскага каад'ютара для Ігната Масальскага.

Міхал Чартарыйскі не згаджаўся ўздымаць пытанні аб віленскай каад'юторыі перад шляхтай на грамнічных сойміках 1756 г. Лічыў, што гэта трэба будзе зрабіць на пасольскіх сойміках 1756 г. Больш падрабязна аб гэтым меркаваў параіцца з Масальскім на запусты (каталіцкія праводзіны зімы) у Слоніме. Туды ж прасіў Масальскага прывесці як мага больш прыхільнікаў. Адносна грамнічных соймікаў 1756 г. Чартарыйскі даваў Масальскаму наступныя парады. У крайнім выпадку магчыма дазволіць выбар дэпутатам у Гродна малодшага з братоў Барановічаў. Сапраўды, той з'яўляецца радзівілаўскім прыхільнікам, але мясцовы шляхецкі лідар Фаміліі Караль Храптовіч мае спосаб перацягнуць Барановіча на свой бок. Канцлер ВКЛ прасіў Масальскага даслаць на мінскі грамнічны соймік свайго афіцэра Свентажэцкага, каб той адгаварыў свайго брата канкурыраваць аб выбары дэпутатам. Канцлер ВКЛ пацвярджаў Масальскаму сапраўднасць дасланай інфармацыі, што ў Коўне мяркуе стаць дэпутатам Антоній Пац і нават згодны, каб з ім дэпутатам быў канкурэнт на выбар трыбунальскім маршалкам ад Фаміліі. Гэтую ранейшую інфармацыю Масальскага яму пацвердзіў Сымон Сіруць. У выніку, што рабіць з ковенскім соймікам, Чартарыйскі меў параіцца з Міхалам Антоніям Сапегай і Юрыям Флемінгам, а аб іх рашэнні абяцаў інфармаваць Міхала Масальскага [1, p. 81–83]. Як бачна, Міхал Чартарыйскі працягваў разлічваць на Міхала Масальскага як на аднаго з галоўных лідараў Фаміліі. Іншая справа, што асноўныя рашэнні аб старанні Юрыю Флемінгу быць абраным дэпутатам на ковенскім грамнічным сойміку прымалася без удзелу Міхала Масальскага. Увогуле канцлер ВКЛ абгаворваў з Масальскім толькі два грамнічныя соймікі: гарадзенскі і мінскі. Гэта непараўнальна мала ў параўнанні з іншымі лідарамі Фаміліі: Міхалам Антоніям Сапегай і Юрыям Флемінгам. Усё гэта сведчыла аб падзенні значэння Масальскага сярод лідараў Фаміліі [6, с. 399–405].

Наступны захаваўшыся ліст быў напісаны ў 1757 г. (24 мая 1757 г. з Прыбыславіцаў) пасля рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ. Міхал Чартарыйскі выказваў Міхалу Масальскаму вялікія шкадаванні з вынікаў рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ 1757 г. Канцлер ВКЛ лічыў віной паражэння на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ нядбайнасць лідараў Фаміліі [1, p. 85]. Гэты ліст дакладна перадае незадаволенасць Міхала Чартарыйскага Міхалам Масальскім, Юрыям Флемінгам і Міхалам Антоніям Сапегай, якія кіравалі пры-

хільнікамі Фаміліі на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ 1757 г. Ім у трох не атрымалася перашкодзіць Радзівілам. Трыбунальскім маршалкам стаў кандыдат Радзівілаў Багуслаў Ясінскі.

Гэты ліст таксама пацвярджае інфармацыю, што ўжо ў маі 1757 г. Міхал Чартарыйскі ведаў аб планах Радзівілаў абраць на наступным Трыбунале ВКЛ 1758 г. маршалкам Андрэя Абрамовіча, а пісарам віленскай кадэнцыі – Ігната Богуша [1, p. 85]. Менавіта таму даволі хутка Фамілія прадпрыняла крокі, каб перашкодзіць ім [6, c. 466–467].

У сярэдзіне 1757 г. паміж Міхалам Чартарыйскім і Міхалам Масальскім назіралася пэўнае ахалоджванне. Чартарыйскі нават абвінавачваў Масальскага ў разрыве супрацоўніцтва з Фаміліяй, і што той дзейнічае толькі ва ўласных інтарэсах [6, c. 464]. Напэўна такая пазіцыя канцлера ВКЛ была выклікана перамовамі аб супрацоўніцтве, якія Міхал Масальскі праводзіў з вялікім гетманам ВКЛ Міхалам Казімірам Радзівілам. Праўда, потым, як даведваемся мы з ліста ад 5 верасня 1757 г., Чартарыйскі пагадзіўся на прапанаваныя праз Масальскага перамовы з Радзівілам. Адзінае – хацеў яшчэ аб гэтым параіцца з Міхалам Антоніям Сапегай [1, p. 89].

Наступны ліст быў напісаны адносна пытання Масальскага аб планах на рэасумпцыю Трыбунала ВКЛ 1758 г. Міхал Чартарыйскі 27 сакавіка 1758 адпісаў вялікі ліст. Інфармаваў, што ад яго прыедзе пільнаваць выбары на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ падскарбі ВКЛ Юрый Флемінг. Прасіў Масальскага дапамагаць яму. Канцлер ВКЛ інфармаваў, што ніколі не меў планаў помсты за прошлы Трыбунал ВКЛ перашкаджаць стаць трыбунальскім маршалкам даўгоўскаму старосце Адаму Бжастоўскаму. Аднак ніяк не мог угаварыць сасупіць ад пратэстацыі супраць слонімскіх дэпутатаў свайго прыхільніка лоўчага ВКЛ Ігната Ланеўскага Ваўка. Таксама паведамляў, што з яго планамі згодны і падканцлер ВКЛ Міхал Антоній Сапега, які прыдзе на рэасумпцыю і будзе дзейнічаць у згодзе з Флемінгам і Масальскім [1, p. 93–96]. З гэтага ліста становіцца зразумелым, што пратэстацыя супраць слонімскага грамнічнага сойміка 1758 г. з’яўлялася прыватнай справай Ігната Ланеўскага Ваўка, а не планамі Фаміліі не дапусціць Адама Бжастоўскага ў лік трыбунальскіх суддзяў. Па гэтаму лісту бачна, што Чартарыйскі перастаў крыўдзіцца на Масальскага за няўдачу на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ 1757 г. Масальскі зноў выступае разам з іншымі лідарамі Фаміліі.

Сярод іншага ў гэтым жа лісце Чартарыйскі інфарміраваў, што па просьбе Масальскага пастараўся аб урадзе мінскага кашталяна для аршанскага гродскага старосты Аляксандра Юзафовіча, а таксама аб урадзе гарадзенскага мечніка для прыхільніка Масальскага [1, p. 94–95]. Гэтыя захады Чартарыйскага скончыліся па-рознаму. Урад мінскага кашталяна дастаўся не Юзафовічу, а Яну Юдыцкаму. Затое ўрад гарадзенскага мечніка атрымаў прыхільнік Масальскага Томаш Храптовіч.

Таксама Міхал Чартарыйскі перадаваў Масальскаму, што перамены ў Пецярбургу (пазбаўленне ўрада канцлера Аляксея Бястужава) хутчэй усяго не прынясуць непрыемнасцяў Фаміліі [1, p. 94]. Такім чынам, Чартарыйскі спрабаваў супакоіць непакоі, якія мелі выклікаць у Масальскага інфармацыя пра перамены ў Пецярбургу.

Вельмі балюча Міхал Чартарыйскі перажываў разрыў з Фаміліяй свайго зяця Міхала Антонія Сапегі. Даведаўшыся, што Міхал Масальскі праязджаў праз Гродна і бачыўся з Міхалам Антоніям Сапегай канцлер ВКЛ у сваім лісце ад 22 чэрвеня 1759 г. выказаў спадзяванні, што польны гетман ВКЛ паведаміў падканцлеру ВКЛ, што “вельмі памылковыя яго разлікі і дзеянні” [1, p. 97].

Падрабязна Міхал Чартарыйскі абгаворваў з Міхалам Масальскім трыбунальскую кампанію 1760 г. Ужо ў лістападзе 1759 г. Міхал Казімір Радзвіл напісаў да Міхала Чартарыйскага, каб той падтрымаў кандыдатам на выбар будучым маршалкам Трыбунала ВКЛ ашмянскага гродскага старосту Андрэя Агінскага. Канцлер ВКЛ паспяшаўся інфамаваць аб гэтым Міхала Масальскага. Адначасова, ён выказваў сваё здзіўленне і незадаволенасць, што такі малады чалавек канкуруе за такі значны ўрад. Як трыбунальскі маршалак ён быў бы пад моцным ціскам загадаў, якія дасылаліся з каралеўскага двара, а з другога боку, Абрамовічы “і ўся кампанія той гайдамацкай банды дырыжыраваць ім захоча”. Менавіта таму, са слоў Чартарыйскага, ён адпісаў Радзівілу толькі ў агульных выразах. Адносна планаў Фаміліі прасіў Масальскага дапамагаць стаць дэпутатам на ўпіцкім сойміку ўпіцкаму падстолію Лепарскаму. У падтрымку Лепарскага Міхала Чартарыйскага прасіў Юрый Флемінг. Пажадана было, каб разам з Лепарскім дэпутатам на ўпіцкім грамнічным сойміку быў абраны Бруноф. Хаця яго выбар, як і выбар больш падыходзячага кандыдата ўпіцкага гродскага суддзі і ўпіцкага войскага Бітаўта, быў сумніўны з-за пазіцыі мясцовай радзівілаўскай групоўкі: каб адзін дэпутат быў іх прыхільнік [1, p. 101–102, 104]. З іншых крыніцаў вядома, што Агінскія дамовіліся аб супрацоўніцтве з Фаміліяй. Гэта прыбрала супрацівы Фаміліі Андрэю Агінскаму да трыбунальскага маршалкоўства. Наадварот Чартарыйскі ўдала “дырыжыраваў” Агінскім, а не Абрамовіч [6, c. 531–532]. Праўда, на некаторых дэпутатаў Міхал Чартарыйскі мог уздзейнічаць не праз трыбунальскага маршалка, а праз Міхала Масальскага. Так, ён прасіў

Масальскага паўплываць на аршанскага дэпутата і аршанскага гараднічага Францішка Васілеўскага, каб ён падтрымліваў захады прыхільнікаў Фаміліі ў Трыбунале ВКЛ 1760 г. [1, p. 112].

Чартарыйскі падрабязна інфармаваў Масальскага аб канфлікце за прэрагатывы ўлады канцлераў. Перадаваў ваганні свайго саюзніка ў гэтай справе кароннага канцлера Адама Малахоўскага і ў яго канчатковым рашэнні змагацца разам з Фаміліяй супраць лідара прыдворнай партыі Юрыя Мнішка [1, p. 102–103]. Пазней Чартарыйскі вяртаўся зноў да гэтай праблемы і інфармаваў аб патрабаваннях Мнішка да канцлераў. Пры іх выкананні каронны надворны маршалак быў згодны прымірыцца з канцлерамі. Канцлер ВКЛ лічыў гэтыя патрабаванні бессэнсоўнымі і быў перакананы, што ў Варшаве прымусіць Мнішка адмовіцца ад іх [1, p. 109].

У гэты час Масальскія былі вымушаны бараніцца ад нападзення каралеўскага двара і вялікага гетмана ВКЛ, якія імкнуліся асудзіць падчашага ВКЛ Яна Масальскага. Прычынай было нібыта тое, што ён, як вайсковец, выклікаў на дуэль свайго непасрэднага камандзіра генерала артылерыі ВКЛ Іяхіма Патоцкага [10, s. 163–165]. Сапраўднай мэтай было вымусіць Масальскіх падчыніцца каралеўскаму двару і парваць з Фаміліяй. У сваім лісце ад 26 лістапада 1759 г. Міхал Чартарыйскі цікавіўся ў Міхала Масальскага, ці ўдалося ўгаварыць Радзівіла адмовіцца ад незаконнага судовага праследваня падчашага ВКЛ Яна Масальскага [1, p. 102]. 16 чэрвеня 1760 г. канцлер ВКЛ прасіў Масальскага інфармаваць аб справе падчашага ВКЛ, аб вырашэнні якой польны гетман ВКЛ меў дамовіцца з Міхалам Казімірам Радзівілам. З гэтых двух лістоў бачна, што Чартарыйскі не ўмешваўся на баку Масальскага ў вырашэнне гэтай справы.

У тым жа лісце ад 6 чэрвеня 1760 г. Чартарыйскі паведаміў, што ўзгадніў планы Фаміліі на пасольскія соймікі з рэферэндарыям ВКЛ Антоніям Пшаздзецкім, а той перадасць іх Масальскаму, а потым Яну Клеменсу Браніцкаму. Адначасова Чартарыйскі хацеў атрымаць інфармацыю ад Масальскага аб пазіцыі Міхала Казіміра Радзівіла, а дакладней, ці пасля атрымання вялікай спадчыны Гераніма Фларыяна Радзівіла будзе далей вялікі гетман ВКЛ падпарадкоўвацца каралеўскаму двару [1, p. 110–111]. Безумоўна, цікавасць у гэтым лісце прадстаўляе інфармацыя аб тым, што моцнае ўзрастанне ўладанняў Радзівіла, на думку Міхала Чартарыйскага, можа зрабіць яго незалежнай ад каралеўскага двара палітычнай фігурай у княстве. Як вядома, спадзяванні Чартарыйскага былі марнымі, а Радзівіл наадварот, даведаўшыся пра супрацоўніцтва Фаміліі з Агінскімі і памерлым Геранімам Фларыянам Радзівілам, больш актыўна дзейнічаў у інтарэсах каралеўскага двара.

У канцы 1760 г. Міхал Чартарыйскі няўдала пераконваў Міхала Масальскага старацца аб выбары дэпутатам, а потым і трыбунальскім маршалкам, а не вылучаць на гэтую ролю сына падчашага ВКЛ. Канцлер ВКЛ пераконваў, што гэта не прывядзе, як лічыў Масальскі, “да грабавой дошкі” польнага гетмана ВКЛ, а наадварот умацуе яго здароўе. Міхал Чартарыйскі быў упэўнены, што Ігнат Пац не можа быць “цяжкім” канкурэнтам за трыбунальскае маршалкоўства. Прычынай было тое, што яму перашкодзяць стаць дэпутатам на ковенскім сойміку. Аб гэтым ужо меў данесці сваім пратэктарам ковенскі маршалак Антоній Забела [1, p. 113–114]. Як вядома, Масальскі не паслухаўся, а яго сын, падчашы ВКЛ Ян, з вялікім пратэстамі быў абраны на грамнічным сойміку ў Мазыры. Гэтыя пратэсты не далі магчымасці Яну Масальскаму ўвайсці ў лік трыбунальскіх суддзяў. Ігнат Пац наадварот праз здраду Фаміліі Сымона Сіруця спакойна быў абраны дэпутатам на ковенскім грамнічным сойміку і стаў маршалкам Трыбунала ВКЛ [6, с. 544–547]. Як бачым, Чартарыйскі цалкам памыліўся наконт магчымасцяў Ігната Паца стаць трыбунальскім маршалкам. Аднак аказаўся правы, што Міхал Масальскі на шмат болей мае шанцаў стаць трыбунальскім маршалкам, чым яго сын. Магчыма, што прычынай адмовы Міхала Масальскага быў не дрэнны стан яго здароўя, а “палітычная хвароба”. Ён добра разумеў, што яго канкурэнцыя да ўраду маршалка Трыбунала ВКЛ прывядзе да супрацьстаяння з Радзівіламі і каралеўскім дваром, як было ў 1756 г. Тым больш, што так сітуацыю з канкурэнцыяй Міхала Масальскага бачыў вялікі гетман ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл [6, с. 541].

Безумоўна, Міхал Чартарыйскі быў незадаволены адмовай Міхала Масальскага канкураваць аб выбары дэпутатам, а потым і трыбунальскім маршалкам. Аб гэтай яго памылцы канцлер ВКЛ напомніў Масальскаму пасля забойства Юзафа Струтыньскага. Чартарыйскі быў вельмі раз’юшаны гэтым забойствам у Вільні побач з Трыбуналам ВКЛ, які менавіта і павінен гарантаваць шляхце бяспеку. Канцлер ВКЛ лічыў, што так адбылося з-за дрэнных выбараў у гэты Трыбунал ВКЛ. Чартарыйскі абяцаў удаве Струтыньскага дамагчыся сатысфакцыі і прасіў дапамогі ёй і ў Міхала Масальскага [1, p. 117–118].

Каралеўскі дварам і магнацкімі групоўкамі было дамоўлена, што Трыбунал ВКЛ 1762 г. будзе пад кантролем Масальскіх, а яго маршалкам мае быць падчашы ВКЛ Ян Масальскі. Міхал Чартарыйскі перадаваў, што, нягледзячы на дамову, існуе непрыязнь да Фаміліі ў вялікага гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Радзівіла. Чартарыйскі добра ўспрыняў планы Масальскага адказваць за выбар прыхільных дэпутатаў на гарадзенскім, ваўкавыскім і аршанскім сойміках. Асноўны фінансавы цяжар за выбар дэпутатаў канцлер ВКЛ ускладаў на польнага гетмана ВКЛ, бо Трыбунал ВКЛ меў быць пад кантролем Масальскіх.

Таксама да Масальскага Чартарыйскі накіроўваў прыхільнікаў, якія павінны былі дзейнічаць на навагрудскім сойміку. Яны мелі ўзгадніць свае дзеянні з Масальскім. Дасылаў Чартарыйскі і копіі лістоў, якія накіроўваў да іх. Асабліва канцлер ВКЛ турбаваўся аб выбарах на трох сойміках у Вільні. Туды як раз ад яго накіроўваўся назіраць за выбарамі на сойміках віленскі падкаморый Гараін. Чартарыйскі прасіў Масальскага ўгаварыць паехаць у Вільню і Антонія Пшаздзецкага. Лічыў неабходным накіраваць і іншых прыхільнікаў Фаміліі на соймікі ў Вільні. Канкрэтна з іх называў толькі гарадзенскага падстолія і гарадзенскага падстаросту Антонія Тызенгаўза, якога меў угаварыць паехаць у Вільню Масальскі. Тызенгаўз, са слоў Чартарыйскага, "не адмовіўся ад такой працы, а пры тых сваіх талентах і здольнасцях быў бы там карысны". Угаворваў Чартарыйскі і свайго прыхільніка Бітаўта, які не хацеў быць дэпутатам, але пагадзіўся па яго просьбе. У сваю чаргу Бітаўт прасіў падтрымкі Міхала Чартарыйскага на дэпутацкім сойміку. Канцлер ВКЛ з атрыманага ліста Людвіка Пацея ведаў, што Пацеі будуць прытрымлівацца нейтралітэта на троцкім грамнічным сойміку. У такім выпадку, Чартарыйскі раіў абраць дэпутатам троцкага падваяводу Юзафа Мікалая дэ Рэаса. Для гэтага канцлер ВКЛ прасіў Масальскага ўгаварыць дэ Рэаса канкурыраваць аб выбары дэпутатам. Адначасова Міхал Чартарыйскі збіраўся пераканаць троцкага цівуна і троцкага падкаморыя Укольскага адмовіцца ад планаў абраць дэпутатам на сойміку ў Троках рэчыцкага земскага судзіца Іяхіма Юдыцкага. На рэчыцкім грамнічным сойміку меў дзейнічаць прыхільнік Фаміліі шляхціц Шалюта. Яго Чартарыйскі таксама накіраваў да Масальскага для ўзгаднення планаў [1, p. 121–124]. Дакладна бачна, што асноўны цяжар падчас выбараў на грамнічных сойміках 1762 г. Чартарыйскі адводзіў Масальскім, якія мелі і кантраліраваць Трыбунал ВКЛ.

У сваім лісце ад 9 лютага 1762 г. Чартарыйскі інфармаваў аб станоўчым заканчэнні сойміка ў Брэсце і абранні на ім дэпутатамі брэсцкага лоўчага Багуслава Верашчакі і прыхільніка Флемінга Ігната Малішэўскага. Таксама канцлер ВКЛ інфармаваў аб выбары дэпутатамі ў Коўне Юзафа Несялоўскага і Марціна Матушэвіча, які арганізаваў Антоній Забела [1, p. 125, 127]. Грамнічныя соймікі сталі прычынай яшчэ большай халоднасці паміж Міхалам Чартарыйскім і Міхалам Масальскім. Асабліва польны гетман ВКЛ быў незадаволены з большых, чым звычайна ў Фаміліі, сваіх выдатках на грамнічныя соймікі. Зближэнне Масальскага з каралеўскім дваром у сваю чаргу выклікала незадаволенасць канцлера ВКЛ [6, c. 568–569].

Чым бліжэй было да рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ 1762 г., тым больш праяўляліся разыходжанні паміж канцлерам ВКЛ і польным гетманам ВКЛ. Добра гэта бачна з ліста Чартарыйскага ад 12 красавіка 1762 г. У ім канцлер ВКЛ пагаджаўся з сцвярджэннем Масальскага, што "ніколі не будзе быць шкодна згода, калі на дабро павернута". Аднак ранейшыя і сучасныя прыклады паказваюць, што "калі прыхільнасць ёсць у перавазе". Чартарыйскі быў упэўнены, што не трэба дапускаць у лік трыбунальскіх суддзяў мінскіх дэпутатаў, і вельмі радаваўся, што аб гэтым сказаў Масальскаму і Міхал Казімір Радзівіл. Таксама канцлер ВКЛ лічыў, што старадубскім дэпутатам не трэба дазваляць станавіцца трыбунальскімі суддзямі. Тым больш, што і дырэктар старадубскага грамнічнага сойміка абяцаў не падпісваць ім крэдэнсы з-за меўшыхся пратэстаў [1, p. 129–130]. Рэасумпцыя Трыбунала ВКЛ 1762 г. прайшла згодна жаданням Чартарыйскага, але не паправіла яго адносін з Масальскім.

Наступны ліст быў напісаны ўжо пасля пасольскіх соймікаў 1762 г. Міхал Чартарыйскі прапаноўваў польнаму гетману ВКЛ прызнаць на сойме нелегітымным выбар брэсцкага пасла Станіслава Крапіньскага. Падставай мелі стаць судовыя рашэнні супраць Крапіньскага, якія меў Міхал Масальскі. Канцлер ВКЛ інфармаваў, што маецца пратэстацыя супраць ковенскіх паслоў, занесеная ў Трыбунале ВКЛ. Больш таго, пратэстуючая шляхта мае паехаць на сойм у Варшаву, каб не дапусціць у лік паслоў абраных паслам з пратэстамі ў Коўне. Чартарыйскі перадаваў і чуткі, што нібыта на каралеўскім двары разважаюць над планам, каб каралевіч Караль у кампенсацыю за Курляндыю атрымаў урад вялікага гетмана ВКЛ і іншыя вышэйшыя ўрады [1, p. 133–134]. Безумоўна, што гэтыя чуткі напужалі Масальскага, які быў галоўным прэтэндэнтам на ўрад вялікага гетмана ВКЛ. Узнікае толькі пытанне: ці верыў ён ім альбо лічыў спецыяльна прыдуманнымі Чартарыйскім? Тым больш, што яны не пацвердзіліся, і ўрад вялікага гетмана ВКЛ атрымаў Міхал Масальскі.

Масальскія фактычна адлучыліся ад Фаміліі і дзейнічалі самастойна. Пацвярджае гэта і ліст Міхала Чартарыйскага ад 10 студзеня 1763 г. з Воўчына. У ім канцлер ВКЛ напісаў да Міхала Масальскага адносна справы будучых грамнічных соймікаў. Чартарыйскі шкадаваў, што лідары Фаміліі не маюць узгодненага плана. Яго ўласны план на грамнічныя соймікі меў перадаць Масальскаму спецыяльна дасланы Антоній Тызенгаўз. Праўда, ён быў хутчэй для інфармацыі, а не для ўзгаднення супольнага плана, бо Чартарыйскі ўжо напісаў сваім прыхільнікам аб дзеяннях на грамнічных сойміках. Перад Масальскім канцлер ВКЛ тлумачыў гэта тым, што да грамнічных соймікаў ужо заставалася мала часу. Пераказваў Міхал Чартарыйскі і сваю прапанову Юрыю Флемінгу старацца стаць маршалкам Трыбунала ВКЛ і адмову таго. Прычынай адмовы Флемінга, са слоў Чартарыйскага, было тое, што падскарбі ВКЛ не бачыў "поўнага адзінства" сярод лідараў Фамілі. Чартарыйскі прапаноўваў у такім выпадку кан-

дыдатам на ўрад трыбунальскага маршалка канюшага ВКЛ Міхала Бжастоўскага, якога павінен быў угаварыць Масальскі. Калі той не пагодзіцца, то Масальскі меў выбарць іншага кандыдата. Выбар дэпутатам кандыдата Фаміліі планавалася правесці на ковенскім грамнічным сойміку. Як раз лоўчы ВКЛ Антоній Забела абяцаў абраць па аднаму дэпутату ад кожнага з варагуючых бакоў. Чартарыйскі перадаў, што вырашаць, якога кандыдата абраць ад Фаміліі дэпутатам, будзе Масальскі і аб гэтым ужо напісаў да Забелы. Сярод іншых кандыдатаў Чартарыйскі вылучаў у дэпутаты мінскага падстолія Ігната Карніцкага. Спачатку хацеў гэта зрабіць у Віцебску, але абозны ВКЛ Леанард Пацей напісаў аб немагчымасці такіх выбараў. Тады Чартарыйскі прапаноўваў, калі Масальскі не знойдзе падыходзячага кандыдата на выбары ў Коўне, то абраць на гэтым сойміку дэпутатам трэба Карніцкага. Чартарыйскі сумняваўся наконт планаў Караля Станіслава Радзівіла стаць дэпутатам у Слоніме і потым маршалкам Трыбунала ВКЛ. Аднак лічыў, што ў любым выпадку прысутнасць у Слоніме Міхала Масальскага і польнага пісара ВКЛ Міхала Казіміра Агінскага не дасць гэтага зрабіць. Пісаў канцлер ВКЛ, каб магчымаму выбару дэпутатам Караля Станіслава Радзвіла перашкодзілі і ў Пінску [1, p. 137–140]. З ліста становіцца зразумела, што Міхал Чартарыйскі вельмі апасаўся разрыва з Масальскімі і нават быў гатовы аддаць у Фаміліі пад іх кіраўніцтва трыбунальскую кампанію 1763 г. Аказваецца, нават у пачатку 1763 г. Чартарыйскі не быў да канца адзначаны ў планах Радзівілаў. Праўда канцлер ВКЛ не верыў, што іх кандыдатам на трыбунальскае маршалкоўства будзе віленскі ваявода Караль Станіслаў Радзівіл, і яго выбар адбудзецца на слонімскім сойміку. Аднак не ведаў ён, што гэтым кандыдатам буде падкаморый ВКЛ Станіслаў Радзівіл, і падыходзячым месцам для яго выбару будзе вызначаны менавіта грамнічны соймік у Слоніме. Таксама Міхал Чартарыйскі ў студзені 1763 г. ведаў аб планах каралеўскага двара склікаць Раду Сената, а пасля экстраардынарыйны сойм. Канцлер ВКЛ лічыў гэты сойм больш шкодным, чым дапаможным. Аб чым і інфармаваў Масальскага [1, p. 140].

Наступны ліст быў напісаны Міхалам Чартарыйскім 20 жніўня 1763 г. з Прыбыславіц у час, калі прыхільнікі Радзівілаў ужо перамаглі ў выбарах на Трыбунал ВКЛ, але для абароны Фаміліі супраць іх у межы княства ўвайшлі расійскія войскі. Задаволены гэтым Чартарыйскі перадаваў Масальскаму, што Караль Станіслаў Радзівіл вельмі напужаны ўваходам расійскіх войскаў у княства. Па інфармацыі канцлера ВКЛ, Радзівіл ужо напісаў ліст да вялікага кароннага гетмана Браніцкага і абяцае ў гэтай сітуацыі дзейнічаць згодна з ім. Зразумела, што такім лістом канцлер ВКЛ імкнуўся супакоіць Масальскага, што рэванш Фаміліі за паражэнне на рэасумпцыі Трыбунала ВКЛ 1763 г. вельмі блізкі. Адначасова Чартарыйскі прасіў інфармацыю, чым скончыліся размовы Масальскага з польным гетманам ВКЛ Аляксандрам Сапегай [1, p. 141–143]. Напэўна Масальскі праводзіў гэтыя размовы з польным гетманам ВКЛ, каб перацягнуць Сапегаў на бок Фаміліі. Сам Масальскі заставаўся верным Фаміліі.

Яшчэ больш актыўна ў інтарэсах Фаміліі Масальскі пачаў дзейнічаць падчас бескаралеўя. Аб гэтым кажа апошні з захаваўшыхся ў Польскай бібліятэцы лістоў ад Міхала Чартарыйскага да Міхала Масальскага. 9 красавіка 1764 г. Чартарыйскі перадаў навіны з Варшавы, а таксама ўдакладніў рухі расійскіх войскаў па тэрыторыі княства. Канцлер ВКЛ выказваў пажаданне, каб войска ВКЛ па загаду Масальскага таксама дзейнічала ў інтарэсах створанай канфедэрацыі Фаміліі і іх прыхільнікаў [1, p. 153–154]. З гэтага ліста бачна, што Масальскі ўжо зноў дзейнічае разам з іншымі лідарамі Фаміліі ў імкненні абраць будучым каралём прыхільніка са сваёй магнацкай групоўкі.

**Заключэнне.** Лісты Міхала Чартарыйскага да Міхала Масальскага з фондаў Польскай бібліятэкі ў Парыжы з'яўляюцца важнай крыніцай па палітычнай гісторыі ВКЛ. Гэтыя лісты дапамагаюць лепш зразумець размеркаванне роляў сярод лідараў Фаміліі, а таксама ўдакладніць іх пазіцыю ў тых ці іншых палітычных здарэннях. Асабліва гэтая карэспандэнцыя дае магчымасць па новаму ацаніць месца і ролю Міхала Масальскага ў справах Фаміліі. Становіцца зразумелым, што ў канцы 30 – пачатку 40-х гадоў. XVIII ст. менавіта Міхал Масальскі быў найбольш набліжанай фігурай у ВКЛ да лідара Фаміліі Міхала Чартарыйскага. Менавіта Масальскі ўзгадняў з Чартарыйскім дзеянні з іншымі ўдзельнікамі "вялікай кааліцыі". Бачна, што Масальскі выступаў разам з Міхалам Чартарыйскім і Юрыям Флемінгам у канфлікце паміж апошняга з іншым лідарам Фаміліі Міхалам Антоніям Сапегай у размеркаванні трыбунальскіх урадаў у 1750 г. Карэспандэнцыя з Польскай бібліятэкі ў Парыжы дакладна паказвае прычыны і наступствы ахаладжэння адносін паміж лідарамі Фаміліі ў другой палове 50-х гг. XVIII ст. Становіцца зразумелым, што Міхал Чартарыйскі імкнуўся пазбегнуць разрыва Масальскіх з Фаміліяй у 1761–1763 гг. Менавіта таму канцлер ВКЛ фактычна аддаў пад кантроль Масальскага ўнутры Фаміліі выбары ў Трыбуналы ВКЛ 1761–1763 гг. Шмат у чым гэтая карэспандэнцыя дапаўняе нашыя веды пра некаторыя палітычныя падзеі, якія ўжо вядомы з гістарычнай літаратуры.

ЛІТАРАТУРА


1. Biblioteka Polska w Paryżu. – Sygn. 54/5.
2. Biblioteka Narodowa. – Sygn. 3285.
3. Zielińska, Z. Walka "Familii" o reforme Rzeczypospolitej, 1743–1752 / Z. Zielińska. – Warszawa, 1983.

4. Palkij, H. Sejmy 1736 i 1738 roku. U początków nowej sytuacji politycznej w Rzeczypospolitej / H. Palkij. – Kraków, 2000.
5. Macuk, A. Kampania trybunalska na Litwie w 1742 r. / A.Macuk // W ceniu wojen i rozbiorów. Studia z dziejów Rzeczypospolitej XVIII i początków XIX wieku. – Warszawa, 2014. – S. 161–180.
6. Мацук, А. Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.) / А. Мацук. – Мінск, 2010.
7. Macuk, A. Wybór pisarzy Trybunału Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 40-h XVIII w. / A.Macuk // Rzeczpospolita państwem wielu narodowości i wyznań XVI–XVIII wiek. – Warszawa-Opole, 2008. – S. 105–124.
8. Archiwum Główne Akt Dawnych // Archiwuma Radziwiłłów. – Dz.IV. – Sygn. 472.
9. Szwaciński, T. Protekcja rosyjska udzielana przedstawicielom szlachty litewskiej u progu wojny siedmioletniej. Postawienie problemu / T. Szwaciński // Kwartalnik Historyczny. Rocznik CXVIII. – 2011. – Z. 1. – S. 47–83.
10. Macuk, A. Między dworem królewskim a stronnictwami magnackimi: Sparawa Jana Massalskiego w latach 1759–1760 / A. Macuk // Wobec króla i Rzeczpospolitej. Magnateria XVI–XVIII wiek. – Kraków, 2012. – S. 163–174.

*Паступіў 13.09.2017*

## CORRESPONDENCE OF MIKHAIL CZARTORYSKI WITH MICHAL MASALSKY FROM THE COLLECTIONS OF THE POLISH LIBRARY IN PARIS AS A SOURCE ON THE POLITICAL HISTORY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA FROM 1737 TO 1764

***A. MACUK***

*On the basis of correspondence from the Polish Library in Paris, the political history of the GDL 1737–1764 is investigated. The author managed to establish the place and role of Mikhail Masalsky in the social and political life of the GDL in the 30–60s of the 18th century, and also the distribution of roles among the leaders of the Familia (political party). It allowed to clarify the position of the leaders of the Familia in certain political incidents. This allows to understand the common and different in the position of the Mikhail Masalsky grouping regarding the other leaders of the Familia and better understand the causes of his conflict with them in 1761–1762.*

***Keywords:*** *magnates, magnates' groups, correspondence, Sejmiks, new sources, the Familia.*